Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: **Вільня, Віленская вул., № 29**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспацэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей, хто на захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год X. 23 Студня 1915 г. № 3

*З гэтым нумэрам спыняецца высылка „Нашай Нівы" усім, хто не аднавіў падпіскі на 1915 год.*

*Падпіску на „Нашу Ніву" прыймаюць усе почты у Расеі. Надпісываючыся на газэту на почці, плаціць за перасылку грошы ня трэба; трэба толькі здаць надпісные грошы начальніку почты і падаць свой акуратны адрэс. На грошы начальнік почты выдае квіт.*

## Поугоду вайны.

19 студня скончылося поўгоду, як узнялася страшэнная вайна,— вайна, якой сьвет яшчэ ня бачыў.

Морэ крыві пралілося. Сотні тысяч душ узяла сьмерць.

Калі загрымелі першые стрэлы, мільёнными арміі немцоў кінуліся с шалёным размахам на двух сваіх ворагоў: на Расею і Францію. Але на дарозі у Францію лягла невялічкая старонка Бэльгія. Немцы пайшлі праз бэльгійскую зямлю, не спадзяючыся ніякіх перашкод. Але Бэльгія ўвайшла у хаўрус с французамі і Англіей і паднялася проці немцоў, каб задзержаць іх паход і даць Франціі час сабраць болей войска. Толькі нядоўга здзержывалі бэльгійцы нямецкую армію. Як патоп, залілі немцы Бэльгію і з налёту аткінулі францускае войска, гонючы яго ажно пад сьцены сталічнага места Франціі—Парыжа. Толькі тут далі ім французы атпор, — немцы крыху адыйшліся, але загадзя ў палові дарогі ад Парыжа да граніцы гэтак добра ўмацаваліся, што і дагэтуль не зыходзяць з мейсца. Безупынна йдуць бітвы, безупынна французы і прысланае на падмогу ім англіцкае войска стараюцца пасунуцца ўпярод, — але з гэтаго блізка нічога не выходзіць.

Іначэй развіваецца вайна на усходзі—між злучэнымі ў моцны хаўрус Нямеччынай і Аўстрыей— з аднаго боку, і Расеей—з другога. Сперша расейцы шпарка перайшлі граніцу Прусіі і пайшлі ажно пад горад Каралевец (Кенінгбэрг). Але ў тым-жэ часі аўстрыяцкая і немецкая арміі кінуліся на Польшчу: аўстрыякі — у Люблінскую губэрню, немцы—па усей заходняй граніцы Польшчы пасунуліся у глыб—ажно да Віслы, пад Варшаву. Расейцы кінулі проці іх аграмадную армію, — і вось у кароткі час немцы адыйшліся ажно да сваей граніцы, а аўстрыяцкае войска было аткінута ў Галіцію, і расейцы, ідучы за імі сьледам, узялі горад Львоў, дайшлі да Карпацкіх гор і нават перайшлі праз іх. Часьць расейцоў была ўжо пад Краковам.

Шчасьце ваеннае — не трывалае: ня доўга сядзелі немцы у Сувальскай губэрні, бо сілы у расейцоў прыбыло і яны перэважылі. Ізноў пачаўся паход у Прусію, ізноў падыйшло расейскае войска пад Мазурскіе возеры і да Гумбінэна. — Затое ў Польшчы немцы узмацаваліся і шырокай хваляй залілі заходнюю часьць яе ажно пад Ловіч, па рэках Бзуры і Равцы, пад Скерневіцы ды пад Кельцы — па рэку Ніду. Аўстрыякам гэтак сама удалося абараніць Кракоў і пасунуцца ўпярод да рэкі Дунайца,

Пакуль тут йдзе змаганьне, ешчэ адна расейская армія заняла Буковіну

Ешчэ йдуць бітвы на Каўказі і на Пэрсіцкай зямлі. Тут сперша расейцы ўварваліся ў межы Турэччыны і занялі Алашкерцкую даліну. Тады туркі кінуліся з заходняго боку на Ардаган і Сарыкамыш і ўвайшлі на зямлю, прыналежачую Расеі. Тутака ім не пашанцавало: іх разбілі, і яны атступіліся. За тое прабавалі зайсьці ўжо з ўсходу: праз Пэрсію. Узялі горад Таўрыз. Ды скора й тут апынуліся расейцы.

Гэтак на ўсіх фронтах поўгоду йдзе крывавае змаганьне многамільёнмых армій. У адным мейсцу перэважываюць адны, у другім— другіе.

Йдзе вайна і на моры — між немцамі і англічанамі. Йдзе у Эгіпце — між англічанамі і туркамі. І не відаць ей канца-краю...

Поўгоду вайны паказало, якіх ахвяр вымагае сучасная вайна. Мала таго, што гінуць людзі і глуміцца дабро іх там, дзе йдуць бітвы: вайна руйнуе ўвесь лад у ваюючых дзержавах—іх экономічнае жыцьцё, промыслы, гандэль.

Найбольш адбіваецца вайна на жыцьці народным у Нямеччыне. Падвозу хлеба і іншых патрэбных тавароў німа, бо па сухапуцьці з Расеі не вязуць, а і з Амэрыкі морэм нельга нічога вазіць: на моры цікуюць на нямецкіе тавары англіцкіе ваенные караблі,—гэтак сама, як нямецкіе — на тарговые караблі англічан. І народ у Нямеччыне выяўляе ўжо сваё нездавольства, клічэ да згоды.

Але да замірэньня йшчэ далёка. Ня гледзячы на тое, што цiжар вайны лёг роўна на ўсіх, — Расея і яе хаўрусьніцы: Францiя і Англія — ня думаюць мірыцца. Яны ўмовіліся ў самым пачатку вайны дзержацца разам і не мірыцца кожнаму па-асобку, лічучы, што толькі тады здалеюць дабіцца, чаго жадаюць, калі зусім паб'юць немцоў.

Цяпер час вайны прыйшоў, і яна, відаць, ня скончыцца, пакуль ня зьменяцца старые граніцы вялікіх эўропэйскіх дзержаў.

# ВАЙНА.

**На Ўсходнім фронце.** Гэты тыдзень дужэ заўзятые і крывавые бітвы адбываліся на левым беразі Віслы на фронце *Божымов—Гумін— Воля Шыдловска—Тартак Болімовскі*, асабліва у районі Божымова. Тутака немцы праз увесь час днём і ночай кідаліся у страшэнна заядлые атакі на расейскіе пазыціі. Вельмі тут выдзеляюцца бітвы 18 студня: скіраваўшы ад раніцы на гэты район страшэнную стрэляніну, немцы сваім быстрым наступленьнем змусілі адну часьць з расейскіх войск адыйсьці на другую лінію акопоў; аднак проці-атакай суседзей праціўнік быў выперты з усіх занятых ім акопоў. Побач з атакай на Божымов немцы пявялі колькі паўторных атак на фронце Гумін—Могелы, такжэ падтрымліваючы іх страшэнным гарматнім агнём. Да поўдня, 18 студня, усе гэтые атакі адбівалі расейцы часьцю агнём, часьцю штыхамі. Каля паўдня немцам пры помачы сільнай стрэляніны іх артылеры па расейскіх акопах удалося прабрацца ў некаторые з іх, але ўжо пасьля 2 гадзіны дня расейцы пусьціліся у агульную проці-атаку і к вечэру 18 студня толькі невялікая часьць расейскіх акопоў і адна с сяліб асталіся у руках праціўніка. 19 і 20 студня у гэтым районі крывавые бітвы не спыняюцца. На пярэдней лініі непрыяцеля увайшлі ў бой 14 з лішнім палкоў. Многалічэбная артылерыя, не вылучаючы і цяжкіх гармат, не спыняе агню ні днём ні ночай. Асабліва заядлы бой ішоў у вёсцы Гуміне, дзе пасьля доўгай рукапашнай схваткі расейцы адбілі заўзятые атакі праціўніка. На правым беразі Віслы на *Млаўскім* напрамку стычкі с праціўнікам сталі часьцейшымі, прычым болей вялікшая з іх была на фронце Ліпно—Бежунь. У **Ўсходней Прусіі** у лясох паўночней *Гумбінена і Пількалена* бітвы не спыняюцца і ў некаторых мейсцох расейцы пасовываюцца наперад. За апошні час расейцы патроху наступаюць у паўнучную Прусію .са стараны *Тыльзіта і Пількапена*, у абход леваго крыла нямецкіх пазыцій і укрэпленьняў на Мазурскіх вазёрах. У **Галіччыні** на Карпатах на фронці ад Дуллінскаго да Вышковскаго перэвалоў заўзятые і крывавые бітвы развіваюцца і пачынаюць прыймаць характар ягульнаго змаганьня. Аўстрыякі атрымаўшы падмогу, мецюцьца вясьці сваё наступленьне найболей далінай Верхняго Сану і дарогамі, што вядуць церазь карпацкіе перэвалы на Самбор і Стрый. С прычыны наступаньня перэвышаючых аўстрыяцкіх сіл на перэвал Баскінд, пярэдніе часьці расейскаго войска адыйшлі троху назад на раней прыгатаваную пазыцію. 22 студня Штаб паведамляе, што на Карпатах бітвы развіваюцца і прыймаюць усё болей і болей упорны характар. Пры чым прыкмечэна тутка не малые сілы немцоў.

**На Каўказкім фронце** апошніе дні значных бітвоў не было. 17 студня расейцы занялі Таўрыз.

**На Заходнім фронце** палажэньне без вялікіх перамен. Праціўнікі як закапаліся у свае акопы, так і ня могуць адзін аднаго з іх выгнаць. Час-ад-часу кідаюцца у атакі то там то сям, але найболей безкарысна. Часам удаецца каторому с праціўнікоў узарваць які адзін другі акоп свайго непрыяцеля, або пасунуцца наперад на якіх 100 сажняў ды больш нічога.

## На вайне і каля вайны.

**Адозва генерал-губэрнатара карскай вобласьці.** Часовы генерал-губэрнатар карскай вобласьці апавесьціў адозву да жыхароў карскай вобласьці: «Прыкмечаные с пачатку вайны с Турэччынай непрыхільные адносіны некаторай малакультурнай часткі хрысьціянскаго населеньня вобласьці да тутэйшых масульманоў, вылiлiся у апошніе дні у адкрытые напады, якіе кончыліся убіўством некалькіх спакойных мусульман. Гэткая вельмі сумная праява, не пасуючая да расейскіх падданых, не павінна мець мейсца у межах нашай бацькоўшчыны. Расея ваюець с турэцкім урадам і войскам, а зусім не с спакойным населеньнем. Спакойные мусульмане, нават належачые да турэцкаго падданства, маюць поўнае права на абарону і апеку расейскіх законоў, не кажучы ўжо аб расейска-падданых мусульманах, якіе лічуцца такімі-ж раўнапраўнымі жыхарамі, як і хрысьціяне». Тлумачучы далей, што гэткі паступак ёсьць самасуд, генерал-губэрнатар заяўляіць, што «вінаватые будуць перададзены ваеннаму суду дзеля засуджэньня павэдлуг законаў ваеннаго часу, якімі вінаватые у такіх праступках караюцца сьмерцяй».

**Увааздушны флот.** Начальнік нямецкаго уваздушнаго флоту гутарыў з амэрыканскім журналістам аб вайне у паветры. Гэта гутарка была надрукована у Times'е:

«Мы з няцерпялівасьцяй чэкаем прыказу на ўваздушную атаку Англіі,—казаў нямецкі авіатар. Мы ужо лёталі к Парыжу, але гэта рэч неважная. С пачатку вайны шэсьць машын нашаго эскадрона зрабілі 15 тысяч міль. Францускіе ваенные аэропляны лятуць хутчэй

## Успомні...

*Пасьвячаю Вл. Станкевічанцы.*

Ўспомні, як згубіш крыльля арліны,
Што моц у высях даюць лунаць,
І сіл ня хопе табе, дзяўчына,
Сьвет і самую сябе змагаць.

Ўспомні, як сетку с пут павуцінных
Мачыха-доля спляце ў жыцьці; —
Як на разстайных станеш пуцінах
І не згадаеш, кудой пайці.

Ўспомні, як згубіш ворага й друга,--
Жыць пачнеш ценем з-над курганоў
Бяз веры ў шчасьце, бяз верных слугаў—
Думак дзявочых, дзіцячых сноў.

Ўспомні, як ночка ляжэ навокал,
Вецер засьвішчэ ў хаўтурны тон,
А сэрцэ дрогне, бы ў клетцы сокал,
І ў душы ўскрэсьне здань быўшых дзён.

Ўспомні ня ў хвілю радасьці дзіўнай,—
З іншым раздзеліш радасьць сваю,--
І не мяне ты ўспомні, дзяўчына,—
Ўспомні, от... гэту думку маю!

**Янка Купала.**

13/XII—14 г.

* * *

Цёмнай ноччу лучына дагарала,
Я Арцёму кашулю вышывала:
Па сярэдзіне—соўнійка,
Навокал зоры дробные.
Толькі ўсходзіць у хату сястрычэнька,—
Белы-часты ліст у руках,
Белы тварык увесь у сьлезах.
«Ой, забілі Арцёма, забілі,
У незнанай старонцы зарылі;
«Ой, забілі Арцёма шрапнэляй,
Завіруха яго крые белай беляй».
Як пачула я тое ды уцяміла,
Мае ніткі неяк памешаліся,
Сонцэ яркае скацілася,—
У вачах памуцілася.
Чаму я на сьвет урадзілася?

**Максім Богдановіч.**

## Патрэба прэдасьцярогі.

С прыбліжэньнем вясны, калі пачне сыходзіць сьнег на палёх быўшых бітвоў і земля размякне ад вясеньней вады—паўстае сур'ёзная небаспечнасьць для жыхароў тых ваколіц, гдзе адбываліся ваенные змаганьня, а такжэ і суседніх з імі. Небаспечнасьць гэту выклікаюць тысячы на скорую руку засыпаных зямлёю нябошчыкоў згінуўшых ваякоў, ат гніцьця каторых лёгка могуць паўстаць уселякіе пошэсные хваробы, асабліва небаспечные там, гдзе насяленьне заморэна недастаткам яды, гдзе ўжо патрэбна сур'ёзная помач са стараны.

Гразьба гэта адносіцца к усяму нашаму краю, як безпасрэдня прылегаючаму к тэатру ваенных змаганьняў. І ў першы чарод небаспечнасьць гэта грозіць Вільні, каторай лічба жыхароў зусім неўспадзеўкі ўзрасла да рэдкай вялічыні, у каторай прыпынілося тысячы бедакоў, уцёкшых сюды са сваіх сяліб

Дзеля гэтаго тут — у цэнтры краю — трэба канечна наперад рыхтавацца к змаганьню з немінучай небаспечнасьцяй.

Але пошэсные хваробы могуць паявіцца у нас толькі аднэй дарогай: дарогай заносу з іншых мейсцовасьцей. Дзеля гэтаго рыхтуючыся к змаганьню с пошэсьцяй у Вільні, трэба ужо цяпер рабіць стараньня к барацьбе з ёю там, дзе гэта пошэсьць можэць паўстаць.

Цяперака у сувальскай губэрні, найболей пацярпеўшай ад вайны, працуюць два лекарска-харчэўные атрады, зладжэные Пірогаўскім таварыством. Гэтые атрады нясуць сур'ёзную помач жыхаром, дапамагаючы у працы мейсцовым организацыям — губэрскім паветовым і гмінным (валасным), каторые паўсемесна ў зруйнаваным краю нарэкаюць на недастачу асьвечэных працоўнікоў, на недастачу дактароў. Гэтак, у сувальскай губ. у вількавышскім павеці ёсьць усяго толькі адзін доктар. Такое-ж палажэньне і ў другіх паветах,—ды і не ў ваднэй сувальскай губэрні!

У зруйнаваные районы (ваколіцы) трэба паслаць не два атрады, а дзесяткі іх. І калі гэтые атрады ня змогуць прахарчэваць насяленьня, калі грамадзянству гэта не па сілі, то абавязкова патрэбна стварыць на мейсцы хоць-бы толькі лекарскіе пункты, абавязкам каторых было-бы сьлядзіць за паўставаньнем заразных хвароб і па сілі магчымасьці спыняць іх.

**В. Г.**

# З Беларусі і Літвы.

### З Віленшчыны.

У Вільні у нядзелю 25 студня, будзе пастаўленя на сцэні у залі «Філярмонія» (Ноўгародзкая 8), беларуская опэрэтка Вінцука Дуніна-Марцінкевіча — „Залёты", да якіх музыку апрацавала вядомая компазыторка п. М. Кімонт. Пачатак роўна а 7 с пал гадзіне вечэра. Білеты прадаюцца у «Беларускай Кнігарні», (Завальная 7) і у бібліотэцы «Знаніе, (Віленская 33), а ў дзень прэдстаўленьня у касе «Філярмонія» ад 2 гадзіны дня да канца прэдстаўленьня.

**Конфіскацыя.** Па загаду віленскаго часоваго цэнзурнаго камітэту сконфіскована № 2 «Нашай Нівы» с сёлетняго году.

**Рэквізыцыя жывёлы** (прымусовая прадажа). «Kur Lit.» паведамляе, што ад 23 студня да 8 марца у віленскай губ. будзе адбывацца рэквізыцыя жывёлы. Штодзень маняцца рэквізаваць у сярэднім 900 штук. Да 1 лютаго парадок рэквізыціі маніцца быць такі: 23 студня будзе рэквізавана 900 штук у віленскім павеці. У рэшты паветах на першы чарод рэквізуецца палавіна прызначэнай лічбы, т. ё. па 450 штук ў сярэднім,—у такіе дні: 24 студня віленскі і дзісьненскі паветы, 25—лідзкі і ашмянскі, 26—свенцянскі і троцкі. Другая вочэрадзь (такжэ па 450 штук на павет): 27 студня — віленскі і вілейскі, 28—дзісненскі і лідзкі, 29 — ашмянскі і сьвенцянскі, 30--троцкі. Трэцьцяя вочэрадзь (на 450 штук). 30 студня—віленскі павет, 31—віленскі і дзісненскі. Не належыць да рэквізыціі такая жывёла: 1) старэйшая за 12 год, 2) лягчэйшая на вагу як 12 пудоў, 3) апошняя адна штука у гаспадара, 4) каровы у апошніх месяцох перад ацяленьнем, 5) слабасільная жывёла, 6) жывёла, запісаная у кнігі хаўрусу, што займаецца гадоўляй жывёлы і 7) жывёла, атрымаўшая нагрода на выстаўках.

Апрача ўспомненай рэквізыціі, трэба спадзевацца ў скорым часе новай. Прымусовай прадажай маняцца узяць яшчэ 30,000 штук.

**Фурманкі на вайну.** У Вільні па загаду Глаўнаго Начальніка аб дабываньні патрэбных рэчэй для арміі адбываецца ад 16 да 22 студня найманьне фурманак для транспортоў (перавозак). Кожны фурман павінен мець добрую павозку і пару коні з упражай, павінен мець добрую адзежу і обуў, сам павінен быць узростам ад 18 да 55 год і не пазбаўленым праў. Кожны фурман атрымлівае 90 руб. у месяц, а за пару запасных коні (без павозкі)—70 руб. Тэрмін службы не агранічываецца і пакінуць службу фурман не мае права, хіба с прычыны хваробы або с пазваленьня начальства. Праз увесь час службы фурман і коні атрымліваюць харчы ад казны дарма.

**Сельска-гаспадарскіе курсы** пры віленскім сельска-гаспадарскім таварыстве аткрываюцца у лютым. Курсы—трохмесячные, прызначэны для падгатоўкі знатакоў-інструктороў па малочнай гаспадарцы. На курсы прыймаюцца толькі мужчыны здатные да працы. Плата за ўсю навуку 25 руб.

**Недастача штучных навозоў**, як можна заўважыць у сельска-гаспадарскіх складах, ужо даець сябе атчуваць, не хапае такжэ сельска-гаспадарскіх машын. Цяперака віленскіе склады стараюцца аб тым, каб як дастаць з Лібавы гэтые штучные навозы.

**Насеньне.** Віленскае сельска-гаспадарскае таварыство занято цяперака прыгатоўкамі к вясьне насеньня, бо спадзеюцца вялікай у гэтым патрэбы ня толькі ад гаспадароў нашаго краю, але і с Польшчы.

**Купля жывёлы для Польшчы.** Цераз Віленское сельска-гаспадарскае т-во адбываецца цяперака скупліваньне жывёлы для Польшчы. Купленая для гэтаго жывёла не рыквізуецца. Маняцца купіць агулам на якіх 400,000 руб.

**За благіе боты**, пашытые для войска, губэрнатар аштрафаваў шаўца Б. Маркуса з Ашмяны на 300 руб. або месяц арышту.

**Пераход у расейскае падданство.** Ат пачатку вайны да 1 студня ў віленскай губ. хлапаталі аб прыняцьці у расейскае падданство 116 нямецкіх падданых, 101

ты. Нават гаспадары старэйшые і тые не маглі уседзіць спакойна дома, а ўсё пераходжывалі адзін к другому і гутарылі аб уродзі хлеба, аб пагодзі, аб грамадзянскіх справах і таму падобнае; і яшчэ ляпей наладжываліся да справунку багатай куцьці.

Сымонава жонка вядомая усім у нашай вёсцы, як добрая, гаманкая і сьмехатлівая кабета, яшчэ зраньня убачыўшыся с дзеўчатамі каля калодзіжа ці інакш дзе, запрашала іх да сябе к вечэру варожыць: «Я ужо — кажэ — і аладкі учыніла ды і Сымон мой дома сядзець ня будзе: ён казаў пойдзе да Мікіты гаманіць; дык прыходзьце, дзевачкі, — варажыць будзе выгодна».

Увесь гэты дзень прайшоў натта хутка, бо усе былі заняты работай, а за працай дзень праходзіць неўзнак. Ды і які тады дзень — гадзіна, а перад вялікім сьвятам хлапот многа: мужчынам трэба прыгатаваць на сьвята корму для свяей жывёлкі, парупіцца, каб не астацца бяз дроў, а бабам трэба прыбраць свае хаткі, каб ня брыдка было, як сьвятам трапіцца чужы чэлавек, а так-жэ трэба і куцьцю зварыць, як належыць.

Сымоніха, кабета была жвавая; яна амаль увесь дзень хадзіла усё подбегам і не заўважыла нават, як падыйшла шэрая гадзіна і як сталі дзеўчаткі зьбірацца адна за другой. Хутка іх наваліла поўну Сымонаву хату, і сьмех іх быў чуцен далёка на вуліцы. Што яны там рабілі, дык аб гэтым ужо успамінаць ня буду, бо што робюць дзеўчаты на багатую куцьцю, я расказаў вышэй. Цяпер я лепш скажу што небудзь аб Сымону.

Сымон як толькі управіўся з работкай, дык нацягнуў свае старые боты і пайшоў да Мікіты, што жыў напроці яго, цераз вуліцу. Там яны перш-наперш гаманілі аб тым, ці добры быў для іх стары год, далей сталі прарочыць, што прынясе ім новы, а пасьля ўсяго, Сымон пачаў расказваць свой страшны сон, што прысьніўся яму прайшоўшую ноч. Ён казаў: што прысьнілася яму, быццым ён ішоў каля глыбокаго калодзіжа, над каторым не было зрубу і каля каторага было выліўшыся лёдам; ідучы ён спаткнуўся і уваліўся у яго, але, пасьля вялікаго стараньня, яму удалося выбрацца аттуль, толькі шапка асталася. Вылезшы с колодзіжа, прачнуўся, але было натта страшка. Кончыўшы расказываць свой сон, Сымон убачыў, што дзеўчаткі пачалі разыйходзіцца; ён адвітаўся з Мікітам і так-жэ пайшоў дамоў.

Прыйшоўшы дамоў, зараз прыняўся куцьцеваць с сваей невялічкай сямейкай, і калі прыйшла чарга есьці куцьцю, ён захацеў абегчы з ёй каля сваей хаткі, як гэта і рабілося па звычаю. Дзеля гэтага сымон апяўся кажухом, потым схапіў у рукі гаршчок с куцьцёй і пабег з ім каля хаты за сонцам, і усякі раз, як падыйходзіў да пярэдняго вугла, стукаў у яго гаршком; тады с хаты жонка пыталася: «Хто там?» а ён атказвае: «Сам Бог!» Два разы Сымон абег натта хутка, а трэйці раз пайшоў ужо трохі цішэй. На гэты раз ён, ідучы, заглядзіўся на крупы, што былі у яго ў гаршку і шкадаваў, што не засеяў ячменям усяго бульбяньня; ён думаў у Новым гаду засеяць шмат большы кусок свайго поля. Пры гэткіх думках Сымон зусім забыўся, што у яго не далёка ад хаты быў стары разваліўшыся склеп, напоўнены у гэты час вадой, якая была пакрыта тонкім пластам лёду.

Сымон неўзнак адыйшоўся воддаль ад сваей хаткі і не заўважыў, як наступіў на лёд. Лёд не стрымаў гэткаго ціжару і лопнуў, а Сымон разам з гаршком шуснуў у склеп з вадой. Жонка яго учула гэты стукі запыталася: «Хто там?» але атрымала атказ: «Сам Чорт!» Сымон тым часам неяк выкарабкаўся, толькі куцьця і шапка асталіся у склепі. Тут ён прыпомніў, што сон яго збыўся, але аб гэтым больш думаць было нельга, бо яго усяго калаціла, як хвораго на трасцу. Ён скарэй кінуўся ў хату і крыкнуў жонцы, каб дала сухую вопратку.

Назаўтрае Сымон дастаў с склепа куцьцю і шапку, а пасьля пайшоў жаліцца Мікіту сваім здарэньням.

**А. Касец.**

аўстрыяцкіх і 7 турэцкіх; здаволена толькі 19 просьб нямецкіх падданых і 12 аўстрыяцкіх, адных славян.

**Патайные браваркі.** Надовічы у Вільні акцызнікі ізноў выкрылі 2 патайные браваркі: у адным гналі гарэлку з мукі, у другім—с палітуры.

## З Міншчыны.

**Забарона п'янства.** Сабраньне мінскіх гарадзкіх упоўнамочэных пастанавіло забараніць на заўсёды таргоўлю крэпкімі напіткамі ў граніцах гораду і на стосажоннай паласе ат граніц гарадзкіх зямель.

**Забарона высекаць лес.** На заседаньні мінскаго лесаахраннаго камітэту пастаноўлена: спыніць рубку лесу у дварэ Короткевічах, Сцепской вол., бабруйск. пав., хвойнік, належачый да Старынскаго Таварыства селян, на 28 год і мешаны лес на 5 год.

**Немцы-колоністы.** У Мінск дастаўлена с плоцкай губ. 240 немцоў-колоністоў, высланных с Польшчы у саратоўскую губ.

**Пад суд.** Аддадзены пад суд віленск. судовай палаты быўшый начальнік лоеўскай почты (мінск. губ.) Кольнінг за прысваеньне і растрату 2,288 руб. 69 кап. ды службавые ашуканства.

**Штраф.** «Сѣв.-Зап. Мысль» аштрафована на 150 руб. за непраўдзівые весткі аб пажары ў памяшчэньні навагрудзкай паліціі.

**Пажар.** У Барысаве згарэла шкляная гута Палецкаго. Агонь быў відаць за 10 вёрст. Страты яшчэ не падлічэны.

**Самагубство** У сяле Цыгоні, слуцк. пав., павесіўся селянін С. Кляскоцэвіч, 70 год. Прычыны не вядомы.

**Пачаставалі.** Не падалёк ад м. Нароўлі, рачыцк. пав. вазакі спірту, сустрэўшы селяніна Н. Гавюка, так участавалі яго гэтым трункам, што той на другі дзень і памёр.

**За патайную бібліотеку.** Паветовы член суду аштрафаваў на 10 руб. або трое суток арышту жыхарку м-ка Мір, навагрудз. пав., за утрымліваньне у сябе без пазваленьня бібліотэкі.

## З Вітэбшчыны.

**Забарона вывазіць жывёлу.** Вітэбскі губэрнатар апавесьціў, што с пазваленьня Глаўнаго Начальніка Двінскаго ваеннаго округу с 9 студня забаронена вывазіць за межы вітэбскай губэрні жывёлу і мяса, апрача целят, авечак і сьвіней, каторые як і раней могуць вывозіцца ў граніцах Двінскаго ваеннаго округу.

**Тры кары сьмерцяй.** Мешчане Душаткін і Каспэрскі і селянін Казакевіч за ўбіўство і аграбленьне жыда у лепэльскім пав. засуджэны ваенна-акружным судом на кару сьмерцяй цераз павешэньне.

**За нявыплату у банк доўгу** вітэбскае аддзеленьне крэсьцьянскаго пазямельнаго банку прызначыло на прадажу с публічных таргоў зямельные участкі 73 селянскіх таварыств і 236 участкоў аддзельных ўласьнікоў.

# З усіх старон.

**Аб прызыве.** Ўласьці пазволяюць прызывацца некаторым навабранцам, калі ёсьць на тое важные прычыны, не там дзе прыпісаны, а там, дзе жыве гэты навабранец. Пазваленьня на гэта маюць права выдаваць губэрскіе па ваеннай павіннасьці прысутства.

**Аб дэзартырах** (уцекачох). Самавольная адлучка ваеннаслужачаго ад каманды ці мейсца сваей службы, калі працягнецца у спакойны час болей як 6 дзён, а ў ваенны час болей трох дзён, лічыцца пабегам. Салдаты, прабыўшые на службе меней 6 месяцоў, лічуцца як уцёкшые пасьля 15 дзён адлучкі у спакойны час і 7 дзён у часе ваенным. Для ўсіх ваеннаслужачых адлучка ад каманды у часе вайны ў районі ваенных змаганьняў, болейаднаго дня лічыцца пабегам.

**Ваенные льготы для школ.** Уласьці прызналі магчымым даваць атсрочку па адбываньню ваеннай павіннасьці да 24 год жыцьця пакліканым у 1915 г. вучням вучыцельскіх сэмінар'яў і школ, каторые аб гэтым будуць хлапатаць перэд належнымі установамі па ваеннай павіннасьці.

**На Чырвовы Крыж** ад пачатку вайны на карысьць хворых і раненых паступіла ахвяр ад прыватных асоб і установоў 49,191,115 руб.

**Акцыз на вату** Ачышчэная вата ападатковываецца да часу асаблівым налогам у 2 руб. 50 кап. ад пуда.

**Запамогі сем'ям раненых.** Сем'і раненых і хворых салдат, увольняных у вотпуск дамоў, не пазбываюцца права на атрымліваньне выдаванай запамагі і ў працягу усяго часу, калі раненые і хворые салдаты знайходзюцца у вотпуску.

**Перасылка грошы ваеннапалонным** у Нямеччыну, Аўстрыю і Вэнгрыю можэ быць атпраўлена толькі па почці пачтовымі пераводамі і ня болей за адзін раз як 300 руб.

**Адозва да доктароў.** Глаўнае упраўленьне Чырвонаго Крыжу звярнулося з адозвай да доктароў, маючых магчымасьць зараз-жэ паступіць на службу. Новые лекары прыймаюцца на такіх варунках: праца да канца вайны, праездных 500 руб., жалованьня—300 руб. на гатовым утрыманьні.

**Аб пашпартах.** Ёсьць праект зусім скасаваць пашпарты; не маняцца толькі касаваць іх для жыдоў.

**Украінскіе часопісі** — «Світло» і «Літэратурно-Науковый Вістнік» закрыты на ўвесь час ваеннаго палажэньня.

**За п'янство.** Кіеўскі губэрнатар паведаміў агульна-дваранскую організацію, што член яе, адвозіўшый падаркі на перэдавые пазыціі, Діатловіч, арыштованы за п'янство на 7 дзён і спаўняў непрыгожую роль у справе атрыманьня конфіскованаго праз паліцію віна у вінатаргоўца Акопова.

**Справа 5-ці дэпутатоў.** У думе ходзюць чуткі, што справа 5-ці дэпутатоў соціал-дэмократычнай фракціі будзе разбірацца 25 студня і працягнецца 1—2 дні, так што Дума зьбярэцца ужо пасьля прысуду.

**Паводка.** У Харкові ад вялікаго дождму паводка. Затоплены ніжэйшые часьці горада. Вада прабілася ў жылые памешчэньня, затапіўшы іх на 2—3 аршыны. Пагінуло шмат дробнай жывёлы і птаства. Амаль ва ўсей губэрніываліў сьнег.

**Сібірскіе марозы.** З Омска паведамляюць, што там пануюць марозы с сільным ветрам даходзячые да 40 градусоў. На вуліцах прост ня можна дыхаць. У друкарнях ня могуць ад холаду працаваць друкары. Стрымана да часу высылка палонных, з баязьні, каб не замёрзлі ў дарозі.

**За друкарскую памылку.** Казанская судовая палата прызнаўшы сьвядомасьць у друкарскай памылцы ў загалоўку агенцкай тэлеграмы засудзіла наборшчыка газэты «Камско-Волжскія Рѣчь» на 2 гады крэпасьці а рэдактара на 500 руб. штрафу.

**К атказу.** Член гасуд. Думы Афанасьев падаў у суд за абгавор у газэці супрацоўніка «Новаго Врем.» Меньшыкова.

**Справа В. Бурцэва.** Петраградзкая судовая палата засудзіла В. Бурцэва за зьневагу Велічэства ў ссылку на пасяленьне, с пазбаўленьнем правоў. Бурцэв жыў апошніе гады у Франціі. Як пачалася вайна ён дабравольна вярнуўся у Расею, дзе і быў арыштаваны на фінляндзкай граніцы.

**За патураньне п'янству.** Па загаду маскоўскага губэрнатара атрымаў атстаўку серпухоўскі спраўнік і яго памошнік за тое, што ня ўмелі, паміма забароны, спыніць у сваім павеці п'янства.

**Адмена цэркоўных збороў.** Сынод у апошнім сваім заседаньні высказаўся за часовую адмену цэркоўных збороў на будоўлю цэрквоў па тэй прычыне, што ў цяперашні час павінны перш за ўсё адбывацца зборы на патрэбы, вымаганые цяперашнім ваенным часам.

**Высылка немак з Рыгі.** У гэтых днях у Рызі адміністрація пачне высылку усіх кабет узростам ад 17 да 60 год, нямецкіх і аўстрыяцкіх падданых.

У **Фінляндзіі** фінляндзкі генерал-губэрнатар па загаду глаўнаго начальніка арміі забараніў на ўвесь час ваеннаго палажэньня прадажу спіртных напіткоў.

У **Польшчы**, Варшаўская паліція абавязала усе таргова-прамысловые установы не запаліваць сьветляных вывесак. Жыхарам загадано шчыльна завешываць вокны асьвечываных памешчэньняў зараз-жэ як толькі пагасюць сьвятло на вуліцах. — Рада міністроў пастанавіла атпусьціць 50 мільёноў руб. на выдаваньне 10-летніх 5-працэнтных пажычак для землеўласьнікоў, дамаўласьнікоў і прамысловых установоў Царства Польскаго.—Надовічы у Варшаві арыштовано 40 людзей, паміж іншымі прэдседацеля скорай помачы д-ра Завадзкаго і прысяжн. адваката Ст. Дзевульскаго. Арыштованых вінавацюць у прыхільнасьці да Аўстрыі.

У **Галіччыні.** Карэспандэнт «Петраградзкаго тэлеграфнаго агенцтва» запярэчывае, што быццым у львоўскім політэхнікуме пачаліся заняцьця на даўнейшых правох. Пазволена толькі здаць пры ім выпускные экзаміны тым студэнтам, што не пасьпелі гэтаго зрабіць да закрыцьця вучэльняў у Галіччыні расейскімі ўласьцямі.—Архіепіскоп Евлогій споўніў у Львові абрад прылучэньня к праваслаўю трох уніяцкіх духоўнікоў.—З Галіччыны высылаецца у томскую губ. д-р філасофіі прафэсар цэркоўнаго права уніяцкай коллегіі епіскоп Сцефан Юрэк.

Рэдактар-Выдавец
**І. Луцэвіч.**

Фирма удостоена на россійскихъ и заграничныхъ выставкахъ
болѣе 100 наградъ.

**СѢМЕНА**

**огородныя, сельско-хозяйственныя, лѣсныя и цвѣточныя,**
самаго высш. достоинства, вѣрныхъ сортовъ и съ испытанной всхожестью, предлагаетъ въ самомъ богатѣйш. выборѣ по сам. умѣренн. цѣнамъ

**Гейнрихъ Геггингеръ въ Ригѣ,**
**Сѣменная торговля (существуетъ съ 1851 г.).**

**Каталогъ** высылается безплатно, а **главный каталогъ** со многими новостями и съ болѣе 700 рисунками высылается за 30 коп., съ наложеннымъ платежемъ 50 коп

Прыймаецца падпіска на 1915 год на беларускую газэту

**„НАША НІВА"**

**ГОД ВЫДАВЕЦТВА Х.**

«НАША НІВА» як і тые гады будзе працаваць над адраджэньнем Беларусі, шырыць беларускую сьведомасць, бараніць інтэрэсоў гаротнаго беларускаго народу.

«НАША НІВА» у публіцыстычным аддзелі друкуе стацьці на палітычные, экономічные і національные тэмы, лепшых беларускіх публіцыстоў; у бэлетрыстычным аддзелі дае апаведаньні, сцэнічные творы і вершы, лепшых бэлетрыстоў і паэтоў. Апрача гэтаго дае многа вестак з жыцьця на Беларусі і з усіх старон. У вясковым жыцьці «НАША НІВА» заменяе сабой штодзенную часопісь.

Цэна «НАШАЙ НІВЫ» на год с перасылкай—2 р. 50 кап.; на поўгода—1 руб. 25 кап.; на 3 месяцы—65 к.; на 1 м. 25 к.

Усе гадавые і поўгадавые падпісчыкі атрымаюць дарма **„Беларускі Календар"**.

**Усе, каму дарага справа адраджэньня беларусоў да культурна-національнаго жыцьця, выпісывайця, чытайця і шырця „НАШУ НІВУ"**.

Адрэс рэдакціі: **Вільня, Віленская 29.**
Рэдактар-Выдавец **І. Луцэвіч.**

Выйшоў з друку

**„БЕЛАРУСКІ КАЛЕНДАР"**

**на 1915 год**

двумя асобнымі выданьнямі, з асобным тэкстам рускімі літэрамі і з асобным тэкстам лацінскімі літэрамі.

**Выпісываць з „Беларускай Кнігарні", Вільня Завальная 7.** Кнігарня просіць прысылаць заказы на календар загадзя, бо у гэтым гаду на палавіну меней друкавана календара і ён хутка разойдзецца. **Цэна без перасылкі 10 к., с пер. 15 к.**

*На пробу календары не высылаюцца.*

Друкарня Марціна Кухты, Татарская 20.